


*Звесткі з архіва Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі*

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з'яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2022 год з'яўляецца юбілейным.*

# 75 гадоў

*Брыль, Я. Нёманскія казакі: апавяданні і нарысы / Янка Брыль. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1947. – 151 с. : іл.*




*Да друку кніга падпісана 23.10.1947. Выданне мела цвёрдую вокладку, партрэт Янкі Брыля і чорна-белыя ілюстрацыі перад кожным творам. Усё мастацкае афармленне кнігі выканана адным з вядучых майстроў у галіне графікі Д. М. Красільнікавым (1903 –1951), які ў пасляваенны час працаваў, як і Янка Брыль, у часопісе «Вожык».*

*Зборнік выйшаў тыражом 10 000 экзэмпляраў.*

# «Нёманскія казакі: апавяданні і нарысы» : 75 гадоў




*Янка (Іван Антонавіч) Брыль (1917–2006) – аўтар шматлікіх кніг, у якіх прадстаўлены ці не ўсе празаічныя жанры – ад мініяцюры да аповесці і рамана.*
*Зборнік «Нёманскія казакі: апавяданні і нарысы» – гэта другая па ліку кніга пісьменніка, у якую ўвайшлі апавяданні «Адзін дзень» (1946), «Казачок» (1946), «Мышалоўкі» (1946), «Алёшка» (1945), «Лазунок» (1947), а таксама дакументальныя нарысы «Нёманскія казакі» (1946), «Гэта было ў Рагачове» (1947), «На заходняй граніцы» (1947). Зборнік прысвечаны тэме Вялікай Айчыннай вайны, у творах адлюстравана гераічная барацьба сялян заходніх абласцей Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.*

# «Нёманскія казакі: апавяданні і нарысы» : 75 гадоў



НЁМАНСКІЯ КАЗАКІ

(Нарыс)

СУСТРЭЧА З ГЕРОЕМ

Пачатак верасня 1946 года.

Партызанская вёска над Нёманам, на паўднёвым узлессі Налібоцкай пушчы. Бур'ян, шурпатыя будкі дачасных будынкаў, зямлянкі. Гэта яшчэ ўсё старое, нязжытае. Няспынны, упарты і ўсцяж нарастаючы стук сякер узнімае на котлішчах светлыя плямы зрубаў.

41

*Галоўныя героі нарыса «Нёманскія казакі» — партызаны 1-й Беларускай кавалерыйскай партызанскай брыгады. Прататыпам камандзіра Міцькі стаў Дзмітрый Дзенісенка, а дзядзькі Валодзі — Уладзімір Царук, удастоены ганаровага звання Героя Савецкага Саюза. Фігуруюць у нарысе камандзіры Уладзімір Кеда, Міхаіл Смалянка, сувязная Валя Пратасевіч, разведчык Леў Бандарык. Гераіняй твора стала і 12-гадовая дзяўчынка Надзя. Янка Брыль апісаў выпадак, калі яна выратавала жыццё двум партызанам-разведчыкам, хаваючы іх у сваім доме падчас яго абстрэлу фашыстамі.*

*Прататыпам юнай гераіні была Надзея Пятроўна Кужалевіч, якая нрадзілася ў вёсцы Крынкі і якая была сувязной аднаго з атрадаў згаданай партызанскай брыгады. Аб гэтым стала шырока вядома толькі праз 70 гадоў пасля вайны, калі Надзея Пятроўна нарэшце наважылася сабраць дакументальныя пацвярджэнні, каб атрымаць пасведчанне ўдзельніка партызанскага руху.*

# «Нёманскія казакі: апавяданні і нарысы» : 75 гадоў




*Творы са зборніка 1947-га года «Нёманскія казакі: апавяданні і нарысы» пазней не раз друкаваліся ў іншых шматтыражных кнігах Янкі Брыля. Але не ўсе яны ўвайшлі ў першы навукова каментаваны шматтомны Збор твораў народнага пісьменніка, падрыхтаваны ў Інстытуце літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі і выдаваемы з 2016 года ў «Мастацкай літаратуры». Справа ў тым, што Янка Брыль яшчэ пры жыцці сам зрабіў абмежаванне на ўключэнне шэрагу напісаных ім тэкстаў у пасмяротныя зборы твораў.*

# «Нёманскія казакі: апавяданні і нарысы» : 75 гадоў

*Волю адносна пасмяротнага выдавецкага лёсу ўсяго, што было ім напісана ад 1937 года, Янка Брыль выказаў ва ўнікальным для беларускай літаратуры дакуменце — «Завяшчанні», датаваным 23-м лістапада 2004 года (яго тэкст змешчаны ў 1-м томе Збору твораў).*



# «Нёманскія казакі: апавяданні і нарысы» : 75 гадоў

У «Завяшчанні» Янка Брыль указаў, з якіх прыжыццёвых выданняў, з якімі зямяненнямі і дадаткамі трэба змясціць у будучым пасмяротным Зборы твораў раманы, аповесці, апавяданні, нарысы, літаратурныя партрэты, публіцыстычныя артыкулы, лісты. Таксама пісьменнік пералічыў тое, што ён просіць і нават патрабуе больш не друкаваць.

У гэтым пераліку якраз і знаходзяцца тры нарысы са зборніка 1947-га года. У прыватнасці, Янка Брыль піша: *«Не трэба больш друкаваць „Нёманскія казакі", „На заходняй граніцы", „Гэта было ў Рагачове" <…>. Яны свой век аджылі».*
Літаратуразнаўцы вызначаюць такі клопат пісьменніка аб будучыні сваіх твораў як сведчанне яго надзвычайнай адказнасці за напісанае.

# «Нёманскія казакі: апавяданні і нарысы» : 75 гадоў

«Чытаючы і перачытваючы напісанае Янкам Брылём, ягоны раман, ягоныя аповесці, апавяданні, эсэ, нарысы, ягоныя мініяцюры (можа, апошнія асабліва), адзначаеш сабе, якім багатым у падзеях, фактах, праявах, чалавечых асобах, якім разнастайным у колерах і фарбах бачыць ён свет, успрымае яго. Здаецца, быццам пісьменніка ў жыцці цікавіць усё, няма для яго галоўнага і другараднага. Вярхоўны суддзя — сам мастак. І тут не проста стыхійнае праяўленне таленту. Для Брыля гэта — эстэтычная пазіцыя. Абагульняльна-філасофскія высновы грунтуюцца на звычайных канкрэтных фактах. Пісьменнік іх, гэтыя канкрэтныя факты, не проста ўзнаўляе, апісвае, ён перадае сваё ўражанне ад іх, сваё разуменне іх. Заўсёды непаўторна-асабістае, арыгінальнае, заўсёды глыбокае».

С. Андраюк

# 75 гадоў

*Прачытаць або праслухаць творы Янкі Брыля, у тым ліку і са зборніка «Нёманскія казакі: апавяданні і нарысы», можна на сайце беларускай электроннай бібліятэкі «Беларуская палічка»: https://knihi.com/Janka_Bryl/*

*2022 год*

*ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ*